Гродзенская гарадская цэнтральная
бібліятэка імя А.Я. Макаёнка
Інфармацыйна-бібліяграфічны сектар

Асобы і падзеі
г. Гродна



# Паэт-змагар Валянцін Таўлай

**Бібліяграфічны спіс літаратуры да 100-годдзя з дня нараджэння**

**ГРОДНА – 2014**

*Паэт-змагар Валянцін Таўлай [Тэкст]: бібліяграфічны спіс літаратуры да 100-годдзя з дня нараджэння /уклад. Д.У. Крачко. – Гродна, 2014. – 14 с.*

## Прадмова



Валянцін Таўлай – адметная постаць у беларускай літаратуры. Ён нарадзіўся ў Баранавічах 8 лютага 1914 года ў сям'і чыгуначніка. У 1920 годзе памерла ад халеры маці Валянціна. У 1924 годзе бацьку звальняюць з працы (як непаляка).

Валянцін вучыцца ў польскай школе, а бацька яго ўступае ў Беларускую сялянска-работніцкую Грамаду. Свае погляды, жыццёвыя прынцыпы ён стараецца перадаць сыну. Аднойчы Валянцін пачуў ад яго такі наказ: "Не чурацца свайго. Нашы дзяды і прадзеды – беларусы… значыцца і ты павінен быць беларусам і на кожнае пытанне аб нацыянальнасці – называць гэтае імя".

Юнак паступае ў Віленскую беларускую гімназію. Але да гэтага ён перажыў арышт бацькі ў час разгрому Грамады. Талент трынаццацігадовага паэта адклікаецца на ўсе падзеі вершамі.

Валянцін знаёміцца з творамі Я. Купалы, Я. Коласа. У гэты ж час ён піша вершы, на многіх з іх адбітак уплываў Багдановіча, Купалы. У Віленскай гімназіі ён адразу ж уступае ў падпольную камсамольскую арганізацыю, удзельнічае ў дэманстрацыях, распаўсюджвае лістоўкі, піша рэвалюцыйнага зместу вершы.

За удзел у акцыях пратэсту Валянцін Таўлай і яшчэ больш 50 вучняў былі арыштаваны. Усіх іх збілі, адправілі ў турму, а пасля выключылі з гімназіі.

Апынуўшыся зноў у вёсцы, Валянцін працягвае падпольную работу. Пасля адной сходкі, у жніўні 1929 года, па даносу правакатара ён быў зноў арыштаваны. З гэтага часу і пачалі з'яўляцца пад яго вершамі подпісы: "Слонім, астрог", "Гродна, астрог", а пазней дабавяцца "Лукішкі", "Ліда, турма". Менавіта тады ляглі на паперу радкі: "…Дарога мая напаткнулася ўчора на шэрыя сцены турмы… "

10 месяцаў цягнулася следства па справе маладога Таўлая. Каб не апынуцца за кратамі ізноў, у кастрычніку 1930 года ён нелегальна пераходзіць мяжу Савецкай Беларусі.

Семнаццацігадовы юнак быў прыняты на работу ў рэдакцыю газеты "Звязда". Ён пісаў палемістычныя артыкулы, аналізаваў

замежную прэсу, чытаў лекцыі аб Заходняй Беларусі, сустракаўся з жывымі класікамі: Я. Купалам, Я. Коласам.

У снежні 1932 года Таўлая накіроўваюць на падпольную работу ў Варшаву. Асноўным плёнам яго працы ў тыя гады было выданне легальнай "Беларускай газеты". Удалося наладзіць выданне спачатку "Літаратурнай старонкі" да гэтай газеты, а затым і часопіса. Неўзабаве рэдакцыі "Беларускай газеты", "Літаратурнай старонкі" былі разгромлены віленскай дэфензівай. Навісла пагроза арышту. Кіраўніцтва падполля прымае рашэнне вярнуць яго ў Мінск. Пры пераходзе мяжы ў студзені 1934 года ён трапляе ў рукі паліцыі. За кратамі нараджаліся новыя вершы. Па творах Валянціна Таўлая можна вывучаць жыццё тагачаснага польскага астрога. Аўтар апісаў цесную "душную" камеру; паказаў як выбівалі "прызнанні" ў арыштаваных, засведчыў як улады голадам імкнуліся зламаць дух вязняў. Шмат канкрэтных дакладных рэалій турэмнага жыцця ўвабралі паэмы "Песня пра сухар" і "Таварыш", што нарадзіліся адпаведна ў 1935 і 1936 гг.

У верасні 1939 года, калі Заходняя Беларусь была далучана да БССР, Таўлай атрымаў свабоду. Ён пачынае працаваць у раённай лідскай газеце "Уперад".

Напачатку Вялікай Айчыннай вайны загінулі рукапісы новых твораў, што з'явіліся ў савецкі час. Таўлай быў разведчыкам, па заданні партызанскага атрада працаваў у нямецкіх установах. У гэты час паэт зрабіў рукапісны зборнік вершаў і аддаў на захаванне таварышам. Зборнік меў сімвалічную назву "Шляхі і краты".

Восенню 1943 года ён быў арыштаваны разам з сям'ёй бацькі. Бацька і мачыха В. Таўлая, трапілі ў лагер смерці Асвенцым. Валянціна і яго сястру ўдалося намаганнямі сяброў і блізкіх выбавіць з няволі.

Вызваленне прыйшло ў ліпені 1944 года. Валянцін Таўлай жыў тады з сям'ёй у Навагрудку, працаваў сакратаром рэдактара раённай газеты "Звязда". Потым ён прыняў запрашэнне жонкі Купалы прыехаць у Мінск і супрацоўнічаць у арганізацыі музея народнага паэта. Таўлай заняўся даследчыцкай работай па творчасці песняра. І ў той жа час рыхтаваў да выдання кнігу свайго выбранага…

Турма, карцэры, галадоўкі падкасілі яго здароўе. Ён пакінуў гэты свет зусім маладым. 27 красавіка 1947 года беларуская літаратура страціла таленавітага і арыгінальнага паэта, публіцыста, даследчыка літаратуры, крытыка, перакладчыка.

# Творы Валянціна Таўлая

1. Таўлай, Валянцін Паўлавіч. Выбраныя творы/ В. Таўлай. - Мінск: Дзяржвыд БССР, 1951. - 218 с., 1 л. партр.

2. Таўлай, В.П. Выбраныя творы : вершы і паэмы / В. П. Таўлай. - Мінск: Вучпедвыд БССР, 1958. - 162 с. - (Школьная бібліятэка).

3. Таўлай, В. Выбраныя вершы і паэмы: для ст. шк. узр. / В. Таўлай. – Мінск, 1967. – 155 с. - (Б-ка беларускай паэзіі).

4. Таўлай, В.П. Вершы і паэмы / Валянцін Таўлай. - Мінск: Народная асвета, 1979. - 80 с. - (Школьная бібліятэка).

5. Таўлай, В. Дзяўчыне; Апошняе слова; Лукішскія вершы; Бацьку; Таварыш: [вершы і паэма] / В. Таўлай // Анталогія беларускай паэзіі. – Мінск, 1993. – Т. 2. – С. 460-464.

6. Тавлай, В.П. Избранное: пер. с бел. / В.П. Тавлай. - Москва: Советский писатель, 1952. - 108 с.

7. Таўлай, В. Лісты з турмы / В. Таўлай // Роднае слова. - 1994. - № 2. - С. 12 – 13.

8. Тавлай, В.П. Стихи и поэмы / В.П. Тавлай. - Москва: Правда, 1958. - 115 с.

9. Таўлай, В. Настаўніку: верш / В. Таўлай // Роднае слова. - 1994. - № 2. - С. 12 - 13.

10. Таўлай, В. Настаўніку; Малой сястрычцы; Хлопцы; Лісты з турмы; Бацькава пісьмо; Рыбак; Навагодні сон; Ранак Перамогі / В. Таўлай // Іскры вечнага агню : зб. вершаў пісьменнікаў-франтавікоў / В. Таўлай. - Мінск, 2005. - С. 459-467.

11. Таўлай, В. Ніва: верш / В. Таўлай // Роднае слова. - 1994. - № 2. - С. 12 - 13.

12. Таўлай, В. Перамога: верш / В. Таўлай // Роднае слова. - 1994. - № 2. - С. 12 - 13.

13. Таўлай, В. Песня пра сухар: [урывак з паэмы] / В.П. Таўлай // Роднае слова. - 1994. - № 2. - С. 12 - 13.

14. Таўлай, В.П. Пілую вершам краты : выбраныя творы: для ст. шк. узросту / В.П. Тавлай; уклад. і аўт. прадм. А.К. Клышка. - Мінск: Юнацтва, 1984. - 95 с. - (Паэтычная бібліятэка).

15. Таўлай, В.П. Творы / Валянцін Таўлай. - Мінск: Дзяржвыд БССР, 1961. - 403 с.

16. Тавлай, В.П. Я с вами: стихи и поэмы / В.П. Тавлай. - Минск: Мастацкая літаратура, 1988. - 143 с. - (Белорусская поэзия).

## Жыццяпіс паэта-змагара



17. Таўлай Валянцін Паўлавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш.– Мінск: БелЭн, 2002. - Т. 15. - С. 459.

18. Таўлай Валянцін Паўлавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш.– Мінск: БелЭн, 2001. - Т. 6, кн. 1. - С. 513.

19. Таўлай Валянцін Паўлавіч // Беларускія пісьменнікі біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіса. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1995. – Т. 6. - С. 80-84.

20. Таўлай Валянцін Паўлавіч // Беларускія

пісьменнікі (1917-1990): даведнік / склад. А.К. Гардзіцкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. – С. 538-539.

21. Башлакоў, М.З. Валянцін Таўлай / М.З. Башлакоў // Памяць: гіст.-дак. хроніка Ліды і Лідскага р-на / М.З. Башлакоў. - Мінск, 2004. - С. 162.




22. Валянцін Таўлай (1914-1947) // Літаратурная карта Берасцейшчыны / укл. А. Крэйдзіч. - Брэст, 2008. - С. 115-119.

23. Грабёнкін, М. Лёсы абаронцаў Навагрудчыны: [партызанскія нарысы] / М. Грабёнкін // Милицейский вестник. - 2009. - 2 июля (№ 27). - С. 6.

24. Жалкоўскі, А. Валянцін Таўлай і Шчучыншчына / В. Жалкоўскі // Дзянніца.- 2004. - 20 сак. - С. 7.

25. Жалкоўскі, А. Крыж мужнасці Влянціна Таўлая / А. Жалкоўскі // Краязнаўчая газета. - 2010. - № 30. - С. 3.

26. Жалкоўскі, А. Крыж мужнасці і пакут Влянціна Таўлая / А. Жалкоўскі // Лідская газета. - 2008. - 29 мая. - С. 3.

27. Жалкоўскі, А. Крыж мужнасці і пакут Валянціна Таўлая / А. Жалкоўскі // Полымя (Карэліцкі раён). - 2008. - 2 ліп. - С. 5.



28. Жалкоўскі, А. Малавядомыя старонкі з біяграфіі Валянціна Таўлая / А. Жалкоўскі // Літаратура і мастацтва. - 2008. - 4 ліп. -

С. 14.
29. Каладзяжная, А.А. Этапы жыццёвых дарог: да 100-годдзя з дня нараджэння В. Таўлая / Анастасія Каладзяжная. - Ліда: Лідская друкарня, 2014 - 145 с.
30. Пракоф'еў, І. Спачатку было слова!..: пра знакамітых пісменнікаў Слонімшчыны / І. Пракоф'еў, М. Марчукова // Слонімскі веснік. - 2009. - 29 жн. - С. 3.
31. Сідарэвіч, А. Таямніца аднаго фотаздымка: пра Валянціна Таўлая (1914, в. Рудаўка Слонім. р-на - 1947), беларускага паэта, літаратуразнаўца, грамадскага дзеяча / А. Сідарэвіч; фота // Лідскі летапісец. - 2012. - № 2. - С. 30.
32. Стадуб, А. Апошні прытулак Валянціна Таўлая: [пра жыццё, дзейнасць і месца пахавання беларускага паэта В. Таўлая (1914 - 1947), журналіста "Лідскай газеты" ў перадваенны час] // Лідская газета. - 1998. - 29 снеж. - С. 2.
33. Таўлай Валянцін Паўлавіч [(1914 - 1947)] // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Слонімскага р-на. - Мінск, 2004. - С. 651-652.
34. Чыгрын, С. Валянцін Таўлай і загадкавая Тоня К.: [пра першае каханне паэта Валянціна Таўлая] / С. Чыгрын // Літаратура і мастацтва. - 2011. - 4 лют. (№5). - С. 13.
35. Чыгрын, С. Пра першае каханне Валянціна Таўлая: пра Антаніну Кулак (1911, в. Рудаўка Слонім. р-на - 2000), каханую дзяўчыну паэта Валянціна Таўлая / С. Чыгрын // Лідскі летапісец. - 2010. - № 2. - С. 22-23.
36. Чыгрын, С.М. Слонімскія падмуркі: гісторыка-краязнаўчыя і літаратуразнаўчыя артыкулы / Сяргей Чыгрын; [прадмова Адама Мальдзіса]. - Мінск: Кнігазбор, 2012 - 295 с.

37. Чыгрын, С. "Шчуплы хлопец, спец па прапагандзе": [пра Валянціна Таўлая] / С. Чыгрын // Літаратура і мастацтва. - 2014. - 14 лют. (№ 7). - С. 7.

38. Ягорычаў, У.Я. Валянцін Паўлавіч Таўлай з вёскі Рудаўка - вядомы грамадскі дзеяч, літаратуразнавец, беларускі паэт / У. Ягорычаў //Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў: матэрыялы рэгіянальнай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 750-годдзю г. Слоніма і 70-годдзю заснавання Слонімскага раённага краязнаўчага музея імя І.І. Стаброўскага. - Слонім, 2002. - С. 276-280.

39. Ягорычаў, У. Валянцін Паўлавіч Таўлай [(1914 - 1947)] з в. Рудаўка - вядомы грамадскі дзеяч, літаратуразнавец, беларускі паэт / У. Ягорычаў // Слонімскі веснік. - 1999. - 11 верас. - С. 2.

40. Ягорычаў, У. Сам ён - звонкая легенда: [пра беларускага паэта, рэвалюцыйнага дзеяча В. Таўлая (1914 - 1947 гг.), жыццё і праца якога былі звязаны з Лідчынай і Навагрудчынай] // Культура. - 1999. - 4-10 верас. - С. 8-9.

## Аб паэзіі Валянціна Таўлая

41. Арочка, М.М. Валянцін Таўлай / М.М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. – Минск, 2001. – Т. 3. - С. 457-458.

42. Арочка, М.М. Валянцін Таўлай: крытыка-біяграфічны нарыс / Мікола Арочка. - Мінск: Беларусь, 1969. - 167 с.

43. Арочка, М. Знакавая постаць [Валянціна] Таўлая / Мікола Арочка // Газ. Слонім. - 2005. - 12 студз. - С. 25.

44. Баль, Б. Вяскоўцы-землякі ўшанавалі Валянціна Таўлая / Барыс Баль; фота // Наша слова. - 2014. - 19 лют. - С. 8.

45. Бурак, А. У вянок Валянціну Таўлаю / А. Бурак // Лідскі летапісец. - 2010. - № 4. - С. 62.

46. Бур'ян, Б.І. І толькі надпіс...: артыкулы і эсе / Барыс Бур'ян. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. - 224 с.

47. Грамадчанка, Т. Шляхі Валянціна Таўлая: [літаратурны партрэт беларускага паэта] / Т. Грамадчанка // Роднае слова. — 1994. - № 2. - С. 7-13.

48. Дзень паэзіі, 2005/ укладанне В. Шніпа. - Мінск: Мастацкая літаратура, 2005 - 318 с.

49. Лойка, А. Пра подзвіг жыццёвы і творчы: [пра творчасць беларускага пісьменніка В. Таўлая] / А. Лойка // Лойка, А. Дрэва жыцця: кніга аднаго лёсу / А. Лойка. - Слонім, 2004. - С. 270-272.

50. Мікуліч, М. "Пілую вершам краты...": пра беларускага паэта Валянціна Таўлая / М Мікуліч // Дзень паэзіі - 2005. – Мінск, 2005. - С. 262-266.

51. Жалкоўскі, А. "Жаўруковы матыў ў паэзіі В. Таўлая": [да 50-годдзя выхаду першай кнігі Валянціна Паўлавіча Таўлая] / А. Жалкоўскі, М. Маліноўскі // Гродзенская праўда. – 1997. – 11 лістап. – С. 3.

52. Калеснік, У.А. Усё чалавечае: літаратурныя партрэты, артыкулы, нарысы / У.А. Калеснік. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1993. - 381 с.

53. Лапіцкая, А. Паэт з "грыпсамі": [да 100-годдзя з дня нараджэння паэта-змагара Валянціна Паўлавіча Таўлая] / А. Лапіцкая // Літаратура і мастацтва. - 2014. - 14 лют. (№ 7). - С. 6.

54. Ляшук, В. Пясняр рэвалюцыйнага змагання: 75 гадоў з дня нараджэння Валянціна Таўлая / В. Ляшук // Роднае слова. - 1989. - № 2. - С. 16 - 18.

55. Маліноўскі, М. "Хачу лунаць арлом...": [да 90-годдзя з дня нараджэння паэта Валянціна Таўлая] /

М. Маліноўскі // Літаратура і мастацтва. - 2004. - 13 лют. - С. 14.

56. Мацулевіч, Ал. Па таўлаеўскім маршруце: [пра Валянціна Таўлая] / Ал Мацулевіч // Літаратура і мастацтва. - 2014. - 28 лют. (№ 9). - С. 15.

57. Мехаў, Ул. Паходня з пірэнейскіх скал: [паэма Валянціна Таўлая "Таварыш"] / Ул. Мехаў // Літаратура і мастацтва. - 2010. - 22 кастр.(№ 42). - С. 13.

58. Таўлай, В. Аб маіх вершах / В. Таўлай // Роднае слова. -1994. - № 2. - С. 12 - 13.

59. Хітрун, А. Яшчэ раз пра Таўлая: [пра Валянціна Таўлая] / А. Хітрун // Літаратура і мастацтва. - 2014. - 14 лют. (№ 7). - С. 8.

60. Целеш, Л. "Будзе песня звінець жаўруком": крыжаванка, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння паэта-змагара Валянціна Паўлавіча Таўлая / Л. Целеш // Звязда. - 2014. - 11 лют. (№ 25). - С. 8.

61. Чыгрын, С. Рэдкія здымкі Валянціна Таўлая / С. Чыгрын // Літаратура і мастацтва. - 2007. - 22 чэрв. - С. 12.

## Успаміны пра Валянціна Таўлая

62. Бибикова, А. В домике Тавлая зазвучат стихи...: [о создании музейной экспозиции в Лидском историко-художественном музее белорусского поэта и деятеля революционно-освободительного движения Западной Беларуси Валентина Тавлая] / А. Бибикова // Гродзенская праўда. - 2010. - 20 сак. - С. 9.

63. Бярозкін, Р. “Паролю сябры, не забудзьце...”: [аб паэце Валянціне Таўлае] / Р. Бярозкін // Бярозкін Р. Паэзія – маё жыццё: літаратурна-крытычныя артыкулы / Р. Бярозкін. - Мінск, 1989. - С. 111-117.

64. Валянцін Таўлай: дакументы, успаміны, артыкулы / складальнік Г.В. Таўлай; каментарыі Л.С. Таўлай. - Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. - 239 с.: іл.

65. Калеснік, У. Абед у Таўлая: [успаміны пра паэта] / У. Калеснік // Калеснік У. Усё чалавечае / У. Калеснік. - Мінск, 1993. - С. 38-59.

66. Марціновіч, А.А. Паходняй сэрца падымнела: [пра В. Таўлая] / А.А. Марціновіч // Марціновіч А. А. Шляхам праўды / А.А. Марціновіч. - Мінск, 1994. - С. 190-203.

67. Мацулевіч, А. Лідскія сяброўкі паэта Таўлая: [паводле ўспамінаў Л. Пуйдак і М. Рысухінай аб працы беларускага паэта ў лідскай газеце "Уперад". 1939 - 1941 гг.] / А. Мацулевіч // Лідская газета. - 2003. - 13 верас. - С. 2.

68. Прыходзька, П.Ф. На хвалях часу: кніга сардэчнай памяці / Пятро Прыходзька. - Мінск : Беларуская навука, 2005. - 183 с.

69. Серафіновіч, К. "Мяне, як і брата, з турмы выкупілі", праз дзесяцігоддзі ўзгадвае Ніна Паўлаўна Радзюкевіч, сястра Валянціна Таўлая: [пра лідскі перыяд беларускага паэта В. Таўлая] / К. Серафіновіч // Лідская газета. - 2002. - 6 жн. - С. 2.

70. Сінілаў, А. Паэт-змагар: [пра В. Таўлая (1914-1947)] / А. Сінілаў // Бацька наш Нёман: вершы, апавяданні, нарысы, эсэ / А. Сінілаў. - Мінск, 2001. - С. 334-336.

71. Таўлай, Н. "Я Ніночку-малышу гэткі вершык напішу": успаміны Ніны Паўлаўны Таўлай пра брата, Валянціна Таўлая (1914 - 1947) / Ніна Таўлай // Лідская газета. - 2012. - 3 крас. - С. 5.

## Ушанаванне памяці

72. Грынкевіч, Я. 100-годдзе Валянціна Таўлая ў Лідзе / Яраслаў Грынкевіч; фота // Наша слова. - 2014. - 12 лют. - С. 2, 3.

73. Жалкоўскі, А. Вызначаны лепшыя: пра ўдзел творцаў лідскага літаб'яднання "Суквецце" ў конкурсе памяці беларускага паэта Валянціна Таўлая / А. Жалкоўскі // Літаратура і мастацтва. - 2006. - 7 крас. - С. 2.

74. Жалкоўскі, А. “Жаўруковае сэрца звініць...”: [да 90-годдзя з дня нараджэння паэта-змагара Валянціна Паўлавіча Таўлая] / А. Жалкоўскі, М. Маліноўскі // Гродзенская праўда. – 2004. – 7 лют. – С. 12.

75. Кебіч, Л. "Пілую вершам краты": пра вечарыну памяці "Паходняй сэрца палымнела" да 100-годдзя бел. паэта Валянціна Таўлая ў ГАНБ імя Я.Ф. Карскага / Людміла Кебіч // Літаратура і мастацтва. - 2014. - 29 лют. - С. 3.

76. Мацулевіч, Л. Па таўлаеўскім маршруце: аб святкаванні 100-годдзя бел. паэта, літаратуразнаўца і грамадскага дзеяча Валянціна Таўлая ў Лідзе / Аляксандр Мацулевіч // Літаратура і мастацтва. - 2014. - 29 лют. - С. 3.

77. Мацулевіч, А. Таўлаеўскі шлях: пра святкаванне 100-годдзя з дня нараджэння беларускага паэта Валянціна Таўлая ў Лідзе / Аляксандр Мацулевіч // Гродзенская праўда. - 2014. - 1 сак. - С. 5.

78. Мацулевіч, А. "У Лідзе жывуць сапраўдныя нашчадкі майго бацькі": да 100-годдзя з дня нараджэння Валянціна Таўлая, беларускага паэта, літаратуразнаўца, грамадскага дзеяча / Аляксандр Мацулевіч // Лідская газета. - 2014. - 13 лют. - С. 15.

79. Рублевская, Л. Жизнь и судьба: [к 100-летию со дня рождения поэта Валентина Павловича Тавлая] / Л. Рублевская // Беларусь сегодня. - 2014. - 1 марта (№45). - С. 10.

80. 100 гадоў з дня нараджэння Валянціна Таўлая [(1914 - 1947)] // Наша слова. - 2014. - 5 лют. - С. 1.

81. Суднік, С. Па Лідзе Бог хадзіў: [верш пра беларускага пісьменніка В. Таўлая] / С. Суднік // Краязнаўчая газета. - 2005. - № 5. - С. 5.

82. Сяргеева, М. Працяг гісторыі музея: пра ўрачыстае свята адраджэння літаратурнага музея беларускага паэта Валянціна Таўлая ў раённым дзяржаўным ліцэі / М. Сяргеева // Слонімскі веснік. - 2007. - 13 лют. - С. 2.

83. Угрынскі, М. Непрытулены - прытулены паэт: да 100-годдзя Валянціна Паўлавіча Таўлая, беларускага паэта, літаратуразнаўца, дзеяча нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі / Міхась Угрынскі // Наша слова. - 2014. - 22 студз. - С. 7.

84. Чыгрын, С. Невядомыя здымкі Валянціна Таўлая: аб рабоце Вялікакракоцкай бібліятэкі Слонім. р-на па ўшанаванню памяці беларускага паэта/ С. Чыгрын // Лідскі летапісец. - 2008. - № 3-4. - С. 48-50.

85. Чыгрын, С. Юбілей паэта: [да 85-годдзя паэта В. Таўлая (1914-1947гг.), чыё жыццё было звязана са Слонімшчынай, Гродна і Лідай] / С. Чыгрын // Газ. Слонім. - 1999. - 4-10 лют. - С. 3.

## Сцэнарыі

86. Рудкоўскі, М. Галоўны экзамен: рэпертуарны зборнік: для сярэд. і ст. шк. узросту: сцэнарый М. Рудкоўскага пра паэта-рэвалюцыянера В. Таўлая /

рэдкал.: Н. Загорская (уклад) і інш. - Мінск: Юнацтва, 1987. - 254с. - ( Тэатр юнага гледача).

## Электронныя рэсурсы

87. Валянцін Таўлай. Вікіпедыя: свабодная энцыклапедыя. Біяграфічныя звесткі. Творчасць [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: be-x-old.wikipedia.org/wiki/ Валянцін Таўлай. – 27.02.2014.

88. Валянцін Таўлай. Нацыянальны паэтычны партал. Беларускія вершы. Белорусские стихи [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: www.vershy.ru/category /valyantsin-taulai. – 27.02.2014.

89. Таўлай: шляхамі “літаратурнай і рэвалюцыйнай дзейнасці [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: www.t-styl.info/by/116/history/12211/. – 27.02.2014.

90. Пакаранне без злачынства: беларуская турэмная паэзія [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: belarusjournal.com/. – 27.02.2014.

## Бібліяграфія

91. Брага, Г.В. 8 лютага - 90 год з дня нараджэння В.П. Таўлая (1914-1947), паэта // Новыя кнігі. - 2004. - № 1. - С. 5-8 (дадат.).

92. Літаратура пра Валянціна Таўлая: бібліяграфія // Роднае слова - 1994. - № 2. - С. 12.

**“Паэт-змагар Валянцін Таўлай”**

Бібліяграфічны спіс літаратуры

да 100-годдзя Валянціна Таўлая

На беларускай і рускай мовах

Складальнік: Крачко Д.У.

Рэдактар: Ілюшына І.М.

Адказны за выпуск: Камарова М.А.

Гродна 2014
культурная
сталіца Беларусі